Каштоўнасці

# КАМФОРТ НЕ ЎНУТРЫ СЯБЕ, А Ў НАВАКОЛЬНЫМ СВЕЦЕ

## Чаму маладыя маці не спяшаюцца ўступаць у шлюб

**У краіне наладжана выдатная сістэма сацыяльнай падтрымкі сем'яў, асабліва шматдзетных. Але ёсць пытанні ў плане псіхалагічнай і матэрыяльнай падтрымкі маладых сем'яў, падахвочванні маладых людзей да больш ранняга ўступлення ў шлюб і нараджэння дзяцей. Такім меркаваннем падзялілася кіраўнік Цэнтра падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля» Вераніка СЯРДЗЮК.**



Фота БелТА

— Цяпер у грамадстве мяняюцца рэпрадуктыўныя ўстаноўкі: узрост уступлення ў першы шлюб павялічыўся ў жанчын да 26 гадоў, у мужчын — да 28 гадоў. Сярэдні ўзрост нараджэння першынца — 29 гадоў. Калі ў мінулыя гады ў нас нараджалася прыкладна 100 тысяч немаўлят, то летась — 87 тысяч. Каля 10 працэнтаў з іх — гэта дзеці, захаваныя ад абортаў, дзякуючы перадабортнаму кансультаванню. Акрамя таго, 60 працэнтаў усіх народжаных дзяцей — гэта другія, трэція і наступныя. Такія паказчыкі сведчаць аб тым, што маладыя людзі на сёння настроены больш на кар'еру, чым на стварэнне сям'і. Нават сярод школьнікаў 6—10 працэнтаў тых, хто ўвогуле не бачаць сэнсу ў рэалізацыі сябе як бацькоў у далейшым. Але дзяржава павінна быць зацікаўлена ў больш ранніх нараджэннях — гэта дае больш шанцаў на тое, што ў перспектыве ў сем'ях будзе больш за адно дзіця.

Вераніка Сярдзюк заўважыла, што на дзяржаўным узроўні ў краіне пакуль што няма курсаў падрыхтоўкі да сямейнага жыцця для моладзі (не для школьнікаў, а менавіта маладых пар). Але ёсць адзінкавыя ініцыятывы.

— Напрыклад, распрацавана праграма сем'язнаўства ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка. Упэўнена, што такія курсы трэба ўводзіць у ВНУ, а не ў школах, бо старшакласнікі звычайна не вельмі хочуць наведваць факультатывы пра сямейныя каштоўнасці, калі ім трэба рыхтавацца да паступлення ва ўніверсітэт. Таксама ў Мінскім гарадскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей вырашаюць цэлы комплекс праблем, аказваюць псіхалагічную падтрымку. Было б добра, калі б такі вопыт па выхадзе з крытычных сітуацый і дапамозе сем'ям, якія апынуліся ў сацыяльна небяспечным становішчы, трансляваўся на ўсю краіну. Думаю, што неабходна і пераймаць вопыт іншых краін, але адаптуючы іх мадэлі пад традыцыі славянскага менталітэту.

Важныя пытанні ў сферы падтрымкі маладых сем'яў на сёння — гэта наяўнасць месцаў у сямейных інтэрнатах, фінансавая дапамога або магчымасць адправіць дзяцей, напрыклад, у дзіцячы сад пры ВНУ, лічыць спікер. «Дагэтуль няма нейкіх забаўляльна-педагагічных, асветніцкіх праграм на тэлебачанні, якія дапамагалі б спраўляцца з сямейнымі праблемамі. Хацелася б, каб яны з'явіліся ў нашай інтэрнэт-прасторы. Увогуле меркаванне амаль кожнага фармiруецца пад уздзеяннем СМІ, інтэрнэту і асяроддзя, аднагодкаў. Калі ў маладога чалавека ёсць вопыт клопату аб маленькім дзіцяці, напрыклад, пляменніку або пляменніцы, малодшым браце або сястры, гэта збольшага рыхтуе да будучага ўласнага бацькоўства, здымае страх», — упэўнена Вераніка Сярдзюк.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Спорт-тайм

# Вяртанне тэніса і залаты дубль «Мінска»

## Што новага ў спартыўным свеце

**У традыцыйным штотыднёвым аглядзе «Звязды» прапануем вашай увазе свежыя спартыўныя навіны.**

**1.** Аляксандра Сасновіч скончыла выступленне на тэнісным турніры ў Празе. Беларуская спартсменка ў матчы другога круга кваліфікацыі прайграла Алене-Габрыэле Русе з Румыніі.

На мінулым тыдні Аляксандра выступала і на турніры Palermo Ladies Open. Падчас спаборніцтваў Аляксандра перамагла саперніцу, вышэйшых за яе па рэйтынгу. У рэйтынгу WTA яна займае 119-ю пазіцыю. У 1/16 фінала беларуская тэнісістка ўпэўнена абыграла ў двух сэтах 23-ю ракетку свету бельгійку Элізэ Мертэнс — 6:4, 6:1. У матчы 1/8 фіналу Аляксандра ў двух сэтах перамагла прадстаўніцу Італіі Ясмін Пааліні, якая займае 95-е месца ў рэйтынгу WTA. Але ў 1/4 фіналу прайграла харвацкай саперніцы Петры Марцінч.

Турнір Palermo Ladies Open стаў першым афіцыйным стартам пасля перапынку, звязанага з пандэміяй COVID-19. Наступным вялікім міжнародным турнірам для Аляксандры Сасновіч стане US Open. На гэтых спаборніцтвах у парным разрадзе выступіць яшчэ адна беларуская тэнісістка Лідзія Марозава.

**2.** 8-9 жніўня прайшоў III этап галоўнага айчыннага турніру па баскетболе 3х3 «Palova». За тытул чэмпіёна змагаліся 138 калектываў. Гэтым разам турнір праходзіў у шасці катэгорыях: «Эліта», «Агульная», «Дзяўчаты 17», «U-14», «U-12».

У спаборніцтвах самай прэстыжнай катэгорыі «Эліта», якія прайшлі 9 жніўня, узялі ўдзел восем камандаў. Перамагла каманда «U-23», у складзе якой выступаюць кандыдаты ў мужчынскую зборную Беларусі 3х3 да 23 гадоў Максім Лютыч, Цімафей Паралёў, Валянцін Назараў і Максім Каратцоў.

IV этап турніру адбудзецца 22—23 жніўня 2020 года. У фінале найлепшыя каманды сустрэнуцца 5 верасня.

**3.** Беларускія шашысткі перамаглі Латвію ў 1/4 фінала Кубка нацый. Спаборніцтвы, арганізаваныя Сусветнай федэрацыяй шашак, праходзяць па 100-клетачных шашках. Першая гульня скончылася ўнічыю. У гульні ў адказ нашы шашысткі абыгралі сваіх апанентаў з вынікам 5:3. У паўфінале беларускі сустрэнуцца з камандай Украіны. У жаночых спаборніцтвах удзельнічалі 11 камандаў, шэсць найлепшых выйшлі ў плэй-оф.

У першым туры беларускі перамаглі каманду Нідэрландаў. Другі раўнд прапусцілі праз няцотную колькасць удзельнікаў, трэці раўнд з камандай Украіны скончыўся ўнічыю. У чацвёртым туры беларускі перамаглі саперніц з Латвіі. У пятым прайграла камандзе Расіі. Але ў шостым абыгралі прадстаўніц Ізраіля і потым прайгралі апанентам з Манголіі. У восьмым і дзявятым раўндзе беларускі перамаглі каманды Кітая і Сурынама адпаведна. Паспяхова склаліся 10-ы і 11-ы раўнды, беларускі абыгралі Эстонію і Бразілію.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**4.** Скончыўся Кубак Беларусі па хакеі на траве сярод жаночых камандаў. Пераможцамі спаборніцтваў сталі спартсменкі хакейнага клуба «Мінск». На другім месцы — гродзенскі клуб «Рытм», на трэцім — «Тэкстыльшчык БарДУ» з Баранавіч. Клуб «Мінск» заваяваў золата чэмпіянату Беларусі сярод мужчынскіх камандаў. Сталічная каманда перамагла брэсцкі «Будаўнік» з вынікам 5:0. Трэцяе месца заняў клуб «Гомель».

**5.** Хакей вернецца на «Мінск-арэну» ўжо ў верасні. 3 верасня «Дынама-Мінск» сыграе першы матч новага сезона. «Зубры» сустрэнуцца з фінскім «Ёкерытам» на «Мінск-Арэне». Матч на беларускім лёдзе пройдзе ў рамках адной з сямі сустрэч. Ён адбудзецца на наступны дзень пасля розыгрышу Кубка адкрыцця. За гэты трафей будуць змагацца 2 верасня маскоўскі ЦСКА і казанскі «АК Барс».

**Валерыя СЦЯЦКО.**


ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
ОАО «Агро-сад Рассвет»

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Предмет торгов:** лот – капитальное строение с инвентарным номером 100/С-55337 (наименование: здание; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 623,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Чернавчицкий с/с, 31, 0,1 км, западнее д. Несвило, здание, на земельном участке с кадастровым номером 121284600001000048, площадью 0,3644 га | | | |
| **Начальная цена, руб. (без НДС)** | **11 468,80** | **Размер задатка, руб.** | **1 146,88** |
| Продавец | ОАО «Агро-сад Рассвет», Брестская обл., аг. Вистычи, ул. Центральная, 22, УНП 200035041 | | |
| Организатор аукциона | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» | | |
| Р/с для перечисления задатка | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 | | |
| Условия продажи | Без условий | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| Условия оплаты | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| Информация о возмещении затрат | Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона | | |
| **Аукцион состоится 02 сентября 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325** | | | |
| Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, а также иную информацию, можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162)-20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52 | | | |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00** | | | |
| **Последний день приема заявлений – 01 сентября 2020 г. до 17.00** | | | |

Ранее извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Агро-сад Рассвет» размещено в газете «Звязда» от 18.02.2020

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Логойского филиала Минского облпотребобщества (продавец) проводит открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ МАГАЗИНА № 89**

***(составные части и принадлежности: сарай, крыльцо)***
**с инв. № 601/С-13147общей площадью 204,5 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623284605301000031 (право постоянного пользования) площадью 0,1063 га по адресу: Минская область, Логойский район, Логойский с/с, д. Слаговище.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 35 742,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **3 574,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **http://www.rlt.by.** Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 22.04.2020.

Аукцион состоится **24.08.2020 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.08.2020 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17.**

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Трест Белтрансстрой»** (УНП 100120922), 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 8, тел. +375172251985, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридическое антикризисное агентство «ВИТКОНСАЛТ».

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **26 августа 2020 г. в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Морской контейнер, 6*2,45, инв. № 177 | 2 233,00 |
| 2 | Бытовка «Штаб», 6*4,8, инв. № 7249 | 6 511,62 |
| 3 | Бытовка «Прорабская», 6*4,8, инв. № 696 | 5 283,01 |
| 4 | Бытовка, 6*2,45, инв. № 7276 | 4 361,56 |
| 5 | Бытовка, 6*2,45, инв. № 110.41 | 4 361,56 |
| 6 | Бытовка, 6*2,45, инв. № 110.36 | 4 361,56 |
| 7 | Бытовка, 6*2,45, инв. № 110.30 | 5 405,88 |
| 8 | Бытовка, 6*2,45, инв. № 110.39 | 4 361,56 |
| 9 | Станок для резки арматуры, инв. № 110.94 | 2 911,80 |
| 10 | Станок для гибки арматуры, инв. № 110.90 | 3 593,68 |

**Местонахождение предметов торгов: РФ, Калужская обл., г. Балабаново, ул. Гагарина, тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.**

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 12.08.2020 г. с 09.00 по 25.08.2020 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о раннее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 04.06.2020 г.